■ З першых вуснаў

Дэйв ЛЬЮІС:

# «НАША МЭТА ЗАСТАЛАСЯ РАНЕЙШАЙ — БАРАЦЬБА ЗА МЕДАЛІ»

## Нацыянальная зборная па хакеі пачала падрыхтоўку да чэмпіянату свету

**Сёлета планетарнае першынство стартуе, па традыцыі, у пачатку мая; гульні чэмпіянату пройдуць у двух расійскіх гарадах — Маскве і Санкт-Пецярбургу. Наша зборная на групавым этапе правядзе свае матчы ў горадзе на беразе Нявы. Сёння на зборы ў Дэйва Льюіса — 28 палявых гульцоў і 4 варатары. Напярэдадні галоўны трэнер нацыянальнай каманды расказаў пра планы падрыхтоўкі, задачы зборнай і пра тое, хто дакладна не паедзе на чэмпіянат свету ў Піцер.**



Фота БЕЛТА.

### Пра кадры

— Нягледзячы на тое, што ўжо сёння на зборы нацыянальнай каманды трэніруецца шмат хакеістаў, мы чакаем яшчэ некалькі гульцоў. З КХЛ павінен прыехаць Джэф Плат. У снежні ў нас з ім была размова, і ён выказаў вялікае жаданне згуляць на сёлетнім чэмпіянаце свету. З чэмпіянату Беларусі да нас павінны далучыцца Раман Дзюкаў, Крысціян Хенкель, Арцём Дзямкоў і Павел Развадоўскі. У Паўночнай Амерыцы працягваюць выступленні Міхаіл Грабоўскі, Кірыл Гатавец, Раман Грабарэнка і Алег Явенка; магчыма, хтосьці з іх зможа дапамагчы камандзе ў Піцеры. На зборах няма Кевіна Лаланда і Уладзіміра Дзянісава: Кевін пакуль трэніруецца ў Канадзе, але хутка будзе ў Мінску, а вось Уладзімір перанёс аперацыю, таму не зможа прыняць удзел у чэмпіянаце свету. Увогуле, склалася няпростая сітуацыя з абаронцамі: акрамя Дзянісава, з траўмамі Стасенка і Бэйлен, узніклі праблемы ў Яўгена Лісаўца.

### Пра занадта працяглы адпачынак

— Многія лідары зборнай сёлета скончылі сезон у сваіх клубах даволі рана, таму быў праведзены падрыхтоўчы збор пад кіраўніцтвам Юрыя Файкова і Андрэя Мезіна. Хакеісты трэніраваліся на лёдзе і па-за ім. Я прасіў настаўнікаў, каб яны стварылі максімальна камфортныя ўмовы для работы спартсменаў, добрую атмасферу, бо самае дрэннае, што можна даць гульцам, — гэта два бесперапынныя месяцы максімальнай трэніровачнай нагрузкі. Для мяне важна, каб хакеісты не перагарэлі.

### Пра прыярытэты

— Сёлета зборнай Беларусі трэба будзе прайсці два сур'ёзныя выпрабаванні — чэмпіянат свету і алімпійскую кваліфікацыю. Цяпер самы важны турнір для нас — чэмпіянат свету, але як толькі ён скончыцца, асноўнай мэтай стануць адборачныя матчы да Алімпійскіх гульняў.

### Учора і сёння

— У чым адрозненне цяперашніх збораў ад леташніх? Зараз хакеісты добра разумеюць сістэму і бачаць, як яна працуе. Летась у некаторых былі сумненні ў яе прадуктыўнасці. Наша мэта засталася ранейшай — барацьба за медалі. У 2015-м мы спыніліся за крок да ключавога матча, таму што трапіўся вельмі складаны сапернік. Каб зрабіць яшчэ крок наперад, трэба дабаўляць па ўсіх напрамках.

Нагадаем, што да старту чэмпіянату свету (6 мая) нашы хакеісты возьмуць удзел у Еўрачэленджы. 8-9 красавіка падапечныя Дэйва Льюіса згуляюць са зборнай Францыі (у Гродне), 15-16 красавіка — на выездзе са зборнай Латвіі, 22-23 красавіка (у Маладзечне і Мінску) — з хакеістамі Швейцарыі, а 29 і 30 красавіка беларусы сустрэнуцца ў гасцях з Германіяй.

Сапернікамі беларускай зборнай на групавым этапе чэмпіянату ў Расіі стануць зборныя Канады, Фінляндыі, ЗША, Славакіі, Францыі, Германіі і Венгрыі. Свой першы матч нашы хакеісты згуляюць 6 мая супраць каманды з краіны Суомі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Мы і птушкі

# ВЫБРАЦЬ ГРАМАДОЙ КРЫЛАТЫ СІМВАЛ СВАЙГО РАЁНА

## На Валожыншчыне галоўнымі прэтэндэнтамі на гэты статус сталі пяць птушак Беларусі

**Такім чынам раённыя ўлады падтрымалі ініцыятыву мясцовых актывістаў разам з грамадскай арганізацыяй «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ). Ініцыятыва была за арнітолагамі, якія запрасілі ў Валожын на «круглы стол» прадстаўнікоў райвыканкама, уладальнікаў аграсядзіб, настаўнікаў біялогіі, работнікаў Мінпрыроды і краязнаўчага музея, дырэктара Рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Налібоцкі» і іншых прадстаўнікоў грамадскасці, каб разам абмеркаваць, як абраць птушку раёна.**

Супрацоўнікі АПБ прадставілі птушак, дзякуючы якім Налібоцкая пушча атрымала статус тэрыторыі, важнай для птушак (ТВП) міжнароднага значэння. Пра кожную птушку былі расказаны цікавыя звесткі. Менавіта з іх планавалася абраць некалькі кандыдатаў для ўсенароднага галасавання. У выніку сустрэчы ўдзельнікі «круглага стала» абралі пяць птушак-кандыдатак. У асноўным гэта віды з Чырвонай кнігі, якія адначасова з'яўляюцца і крылатымі жыхарамі Налібоцкай пушчы. Пасля дыскусій прэтэндэнтамі на птушку-сімвал Валожыншчыны сталі **зімародак, чорны бусел, пугач, малы арлец і... глушэц.**

А апошні з'явіўся ў канчатковым спісе дзякуючы Васілю Гуркову, дырэктару Налібоцкага заказніка, дзе збіраюцца разводзіць гэтую знікаючую птушку ў спецыяльным гадавальніку. Астатніх птушак арнітолагі прапанавалі таксама з абгрунтаваннем. У Валожынскім раёне, напрыклад, самая вялікая ў Беларусі папуляцыя зімародка. Гэту хуткую птушку няцяжка заўважыць на рэчках пушчы. Малы арлец на Валожыншчыне гняздуе ў пушчы, а палюе на палях, дзе яго таксама можна ўбачыць. Пугач — самая буйная сава ў свеце, і ў Налібоцкай пушчы заўсёды жыве некалькі іх пар. Забалочаныя поймы ў спалучэнні з ляснымі масівамі — любімыя месцы рассялення чорнага бусла.



Зімародак.



Малы арлец.

А з 17 сакавіка на сайце АПБ пачалося галасаванне за адну з гэтых птушак. Ад голасу кожнага валожынца залежыць, якім будзе сімвал іх раёна, паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэсслужбе АПБ.

Пасля таго як сімвал абяруць, у горадзе паставяць скульптуру птушкі, намалююць графіці з яе выявай. Таксама пройдзе шэраг мерапрыемстваў у школах горада, мэтай якіх стане павышэнне дзіцячай зацікаўленасці прыродай і экалогіяй рэгіёна. Будуць праводзіцца трэнінгі і майстар-класы з уладальнікамі аграсядзіб. Іх навучаць, як арганізаваць «прыродныя» экскурсіі, раскажуць, якія крылатыя суседзі могуць завітаць на падворкі. А мясцовых рамеснікаў навучаць вырабляць унікальныя сувеніры. Спецыялісты мяркуюць, што новы сімвал зможа прыцягнуць у раён больш экатурыстаў, бёрдвотчараў і фатографаў дзікай прыроды. Таксама ёсць надзея, што шэраг запланаваных мерапрыемстваў заахвоціць людзей быць больш актыўнымі ў захаванні біяразнастайнасці нашай краіны.

— Выбар птушкі раёна — практыка пакуль новая для Беларусі, але досыць распаўсюджаная ў свеце. Так, кожны штат у ЗША можа ганарыцца сваёй птушкай-сімвалам, грамадзяне Вялікабрытаніі абралі нацыянальнай птушкай заранку, а ізраільцяне — удода. Усё гэта дапамагае не толькі выгадна пазіцыянаваць рэгіёны на турыстычным рынку і прыцягнуць увагу да рэгіёну і да экатурызму, але і дае магчымасць згуртавацца мясцовым жыхарам вакол агульнай ідэі — усведамлення прыроднай каштоўнасці месца, у якім жывеш. Мы ўпэўнены, што хутка жыхары Валожынскага краю адчуюць гэта, а наша практыка разляціцца па іншых рэгіёнах, — адзначае **арганізатар ініцыятывы АПБ Карына САЛАВЕЙ.**

Нагадаю, што свае птушкі-сімвалы ўжо ёсць у двух раёнаў Беларусі: «візітоўкай» Слуцка стаў салавей, а Мёраў — журавель.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

**30 САКАВІКА**

**1896** год. Свет упершыню пачуў пра псіхааналіз. У чацвёртым томе часопіса Revue Neurologique, які выйшаў у Парыжы, быў апублікаваны артыкул «Спадчыннасць і этыялогія неўрозаў». Артыкул быў на французскай, а яго аўтар — мала каму вядомы венскі псіхіятр Зігмунд Фрэйд. Нягледзячы на катэгарычнае непрыманне псіхааналізу шэрагам аўтарытэтных медыкаў, з часам фрэйдызм заваяваў шырокую папулярнасць.



**1970** год. На экраны СССР выйшаў фільм Уладзіміра Матыля «Белае сонца пустыні». Гэты культавы савецкі «істэрн» для некалькіх пакаленняў гледачоў стаў адным з самых любімых фільмаў. Праца над стужкай ішла цяжка, яна падвяргалася цэнзуры, але была выратавана пасля прагляду на дачы Леанідам Брэжневым. Абмежаваная прэм'ера карціны для стваральнікаў і кіраўніцтва адбылася 14 снежня 1969 года ў ленінградскім Доме кіно. Прэм'ера на шырокім экране ў сталіцы адбылася 30 сакавіка 1970 года. У пракат «Белае сонца пустыні» выпусцілі досыць вялікім накладам — 1410 асобнікаў. Нароўні з камедыямі Леаніда Гайдая і серыялам «Сямнаццаць імгненняў вясны» «Белае сонца пустыні» стала чэмпіёнам па ліку паказаў на ТБ. Па традыцыі фільм перад стартам глядзяць расійскія касманаўты.

**1931** год. 85 гадоў з дня нараджэння Пяткевіча Аляксея Міхайлавіча, беларускага літаратуразнаўца, крытыка, краязнаўца, кандыдата філалагічных навук. Аўтар манаграфіі «Сюжэт. Кампазіцыя. Характар: аб прозе Кузьмы Чорнага», раздзелаў у «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры», «Гісторыі беларускай літаратуры XIX — пач. XX ст.».

**Было сказана**

**Максім ТАНК, народны паэт Беларусі**

*«Самая страшная рэч — абыякавасць. Калі з ёй не змагацца, яна, як дрыгва, можа загубіць любога чалавека».*

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# ЧАС РЫХТАВАЦЬ БУЛЬБУ ДА ПАСАДКІ

**Першы вясновы месяц амаль скончыўся, зусім мала часу застаецца да пачатку пасадкі бульбы, а нам яшчэ трэба да гэтага адказнага працэсу падрыхтавацца. Дык пачнем, не адкладаючы.**

### Навошта гэта патрэбна?

Рыхтаваць бульбу да пасадкі трэба. Па-першае, правільнай і своечасовай папярэдняй падрыхтоўкай мы запускаем у клубнях біялагічныя працэсы, звязаныя з утварэннем парасткаў і развіццём каранёвай сістэмы. І дзякуючы такому старту пасля пасадкі атрымаем больш раннія і дужыя ўсходы, чым пры выкарыстанні непадрыхтаванага пасадачнага матэрыялу.

Па-другое, на гэтым этапе мы можам выбракаваць хворыя і малапрадуктыўныя клубні — тыя, у якіх выявіліся розныя гнілі, утварыліся слабыя, ніткападобныя парасткі або зусім не прачнуліся вочкі (так таксама здараецца, асабліва калі ўмовы захоўвання былі парушаныя). Адпаведна, усходы атрымаюцца больш роўнымі і дружнымі, не будзе «пралысін» у радках.

### Калі пачынаць?

У залежнасці ад выбранага метаду, спатрэбіцца ад 30 да 3 дзён. Праўда, трэба разумець, што «экспрэс-метады» не заўсёды надзейныя — гэта, хутчэй, «палачка-выручалачка» для тых, хто не змог падрыхтаваць клубні своечасова.

Існуе таксама перадпасяўная апрацоўка, якую праводзяць непасрэдна перад пасадкай, выкарыстоўваючы розныя пажыўныя растворы або попел.

### Спосабы

Выбар спосабу залежыць ад наяўных умоў. Часам яго дыктуюць абставіны: напрыклад, калі пасадачны матэрыял быў набыты незадоўга да пасадкі, займацца прарошчваннем ужо проста няма калі — патрэбны іншыя метады. Таму, нават калі вы заўсёды карыстаецеся нейкім адным варыянтам, варта мець уяўленне і пра іншыя — раптам спатрэбяцца?



***Прарошчванне***

Мэта — атрыманне моцных, здаровых парасткаў, што пасля пасадкі паскорыць з'яўленне ўсходаў, а ў перспектыве — наблізіць пачатак утварэння клубняў і павялічыць ураджай. Гэта асноўны і, мабыць, найбольш эфектыўны і дзейсны метад падрыхтоўкі. Прарошчванне можа быць сухім і вільготным, у залежнасці ад створаных умоў.

***Сухое прарошчванне***

Сярэдняя працягласць — 30 дзён (дыяпазон — ад 20 да 40 дзён). Важныя ўмовы: святло і захаванне тэмпературнага рэжыму.

Роля асвятлення ў гэтым выпадку двайная. Па-першае, калі святла мала, парасткі выцягваюцца і атрымліваюцца బледнымі, слабымі. Прарошчванне на святле дае менавіта той вынік, які нам патрэбен: дужыя, трошкі прысадзістыя парасткі з зачаткамі каранёў і лісця; колер парасткаў можа вар'іравацца ў залежнасці ад сорта бульбы (белыя, ружаватыя, бэзавыя і г.д.). Па-другое, як мы памятаем, у бульбяных клубнях на святле ўтвараецца саланін, і яны зелянеюць. Для харчовай бульбы гэта катэгарычна шкодна, а вось для пасадачнага матэрыялу — выключна карысна. Празялененыя клубні набываюць своеасаблівы імунітэт і менш пашкоджваюцца хваробамі, становяцца больш устойлівымі да ўздзеяння неспрыяльных умоў. А яшчэ — іх не любяць грызуны.

Каб клубні асвятляліся раўнамерна, іх раскладваюць у 1 (максімум 2) слаі; калі месца дазваляе — на падлозе, калі не — у скрыні, іншую прыдатную тару. Скрыні можна ставіць адна на адну, але тады іх давядзецца рэгулярна пераастаўляць, мяняць месцамі, каб усе клубні атрымлівалі роўную колькасць святла. Можна выкарыстоўваць сеткі або вузкія празрыстыя поліэтыленавыя пакеты (прарабіўшы ў іх папярэдне адтуліны для доступу паветра), але гэта не так зручна — клубні ўнутры такой ёмістасці асвятляюцца недастаткова, а перакладаць іх — залішне працаёмкі працэс, небяспечны да таго ж пашкоджаннем парасткаў.

**Бухгалтерский баланс за 2015 год**

**ОАО «НеоТрейдЗапад»** *Млн.руб.*

| Наименование статей | На 31.12.2015 | На 31.12.2014 |
|---|---|---|
| I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ | 2237 | 2215 |
| II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ | 1614 | 1771 |
| БАЛАНС | 3851 | 3986 |
| Собственный капитал и обязательства | **На 31.12.2015** | **На 31.12.2014** |
| III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | 3700 | 3858 |
| Уставный капитал | 697 | 697 |
| Добавочный капитал | 2735 | 2735 |
| Нераспр. прибыль(непокрытый убыток) | 268 | 426 |
| IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | - | |
| V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | 151 | 128 |
| **БАЛАНС** | **3851** | **3986** |

**Отчет о прибылях и убытках за 2015 год**

| Наименование показателей | На 31.12.2015 | На 31.12.2014 |
|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 436 | 576 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | (627) | (387) |
| Валовая прибыль | (191) | 189 |
| Управленческие расходы и расходы на реализацию | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | (191) | 189 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 1 | - |
| Прочие расходы по текущей деятельности | (66) | (100) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | (256) | 89 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 73 | 420 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | - | (168) |
| Доходы по финансовой деятельности | 29 | 15 |
| Расходы по финансовой деятельности | - | (9) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | 102 | 258 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | (154) | 347 |
| Налог на прибыль | (4) | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли(дохода) | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) | (154) | 347 |
| Совокупная прибыль (убыток) | (154) | 347 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | - | - |

Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: 29 марта 2015 года. Основным видом деятельности общества является сдача в наем собственного недвижимого имущества. С 01.07.2015 г. ОАО «НеоТрейдЗапад» работает по общей системе налогообложения.

Директор ОАО «НеоТрейдЗапад» Н.В. Рубец

**ОАО «БЕЛГАЛАНТЕРЕЯ»**

г. Минск *УНП 100230667*

**БАЛАНС по состоянию на 1 января 2016 г.** млн. руб.

| АКТИВ | СУММА | ПАССИВ | СУММА |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1. Основные средства Справочно: первоначальная стоимость – 16 438 амортизация – 7 720 | **8 718** | 1. Уставный капитал | **1 124** |
| 2. Нематериальные активы | **5** | 2. Резервный капитал | **26** |
| 3. Финансовые вложения | **6** | 3. Добавочный капитал | **7 476** |
| 4. Запасы, в т.ч.: материалы – 210 товары – 5 539 | **5 749** | 4. Нераспределенная (неиспользованная) прибыль | **1 515** |
| 5. Расходы будущих периодов | **116** | 5. Краткосрочные кредиты | **0** |
| 6. Денежные средства | **38** | 6. Задолженность перед участниками (учредителями) | **22** |
| 7. Краткосрочная дебиторская задолженность | **5 646** | 7. Краткосрочная кредиторская задолженность | **10 115** |
| БАЛАНС | **20 278** | БАЛАНС | **20 278** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 01.01. 2015 г. по 31.12.2015 г.** млн.руб.

| Наименование показателя | Код стр. | За отчетный период |
|---|---|---|
| 1.Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 69 675 |
| Начисленный НДС, исчисляемый из выручки от реализации товаров, работ, услуг | | 11 480 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 020 | 48 440 |
| Расходы на реализацию | 050 | 8 468 |
| **Прибыль (убыток) от реализации товаров, работ, услуг** | **060** | **1 287** |
| 2.Прочие доходы и расходы по текущей деятельности. Прочие доходы | 070 | 37 |
| Прочие расходы | 080 | 476 |
| 3.Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 848 |
| 4.Доходы и расходы по инвестиционной деятельности. Доходы по инвестиционной деят. | 100 | 0 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | 14 |
| 5. Доходы и расходы по финансовой деятельности. Доходы по финансовой деятельности | 120 | 17 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | 113 |
| **Прибыль (убыток) до налогообложения** | **150** | **738** |
| Налог на прибыль | 160 | 208 |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли | 200 | 1 |
| **Чистая прибыль (убыток)** | **210** | **529** |

**Информация о дивидендах и акциях:**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 52,9 | 72,9 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 1 083 | 1 492 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тысяч рублей | 207,5 | 198,5 |
| Количество акционеров, всего | лиц | 277 | 315 |
| В том числе: юридических лиц | лиц | 3 | 4 |
| физических лиц | лиц | 274 | 311 |
| Среднесписочная численность работников | человек | 79 | 84 |

Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %): 35,28.
Республиканская собственность — 31,72%.
Коммунальная собственность — 3,56%.
Основной вид деятельности — оптовая торговля.
Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: **29 марта 2016 года.**

Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

ІУДА. У народнай культуры гэты хрысціянскі персанаж займае пэўнае месца сярод шматлікіх міфалагічных апавяданняў і абрадавых дзеянняў.

◈ У народнай культуры і сёння існуе шэраг забарон, якія звязаны з паводзінамі Іуды на Тайнай вячэры і з яго здрадай:

— нельга браць соль з сальніцы пальцамі, як гэта рабіў Іуда; мачаць лусту хлеба ў сальніцу; класці лыжку «дагары дном» (сёння так кладуць лыжкі толькі за жалобным сталом);

— за святочным сталом не павінна сядзець адначасова 13 чалавек — столькі іх было падчас Тайнай вячэры;

◈ Іуда пакончыў жыццё самагубствам. Паводле славянскіх паданняў, ён павесіўся на асіне, з-за чаго яна ўвесь час дрыжыць. Кроў Іуды трапіла на вольху, праз гэта яе драўніна набыла чырвонае адценне. Але былі і іншыя версіі: Іуда быў раздаўлены дрэвам; разбіўся, зваліўшыся са скалы; яго цела згніло ад невядомай хваробы; быў раздушаны навальніцай на мноства частак і раскіданы па ўсім свеце; з яго цела вырас тытунь (як варыянты — цыбуля, часнок ці хрэн).

◈ У народзе казалі, што менавіта пасля смерці Іуды на зямлі з'явіліся вісельнікі, тапельцы і самазабойцы.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 6.47 | 19.42 | 12.55 |
| Віцебск | 6.35 | 19.33 | 12.58 |
| Магілёў | 6.37 | 19.33 | 12.56 |
| Гомель | 6.35 | 19.28 | 12.53 |
| Гродна | 7.02 | 19.57 | 12.55 |
| Брэст | 7.04 | 19.56 | 12.52 |

**Месяц**

***Поўня 23.03 — 30.03. Месяц у сузор'і Казярога.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Аляксандра, Аляксея, Віктара, Макара.*
***К.*** *Амеліі, Ірыны, Леанарда, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА





## УСМІХНЕМСЯ

**Учора хацеў знайсці новую працу, але зайшоў на кухню і знайшоў бутэльку каньяку. Крыху супакоіўся.**

— Ты хто па гараскопе?
— Я веган!
— Няма такога знака Задыяка.
— Выдатна сябе адчуваю!
— Што ты нясеш?
— Ты раздражнёны. Гэта з-за мяса.

**Не вынайшлі яшчэ пакуль лепшага спосабу эканоміі грошай, як не выходзіць з дома ні з якой нагоды.**





Малюнак Уладзіміра ЧУГЛАЗАВАА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.108. Індэкс 63850. Зак. № 1193.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 29 сакавіка 2016 года.